PARITETBANK

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2020 года

Наименование банка: ОАО «Паритетбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2020	01.01.2020
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	39 067	30 252
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	54 091	35 923
5	Средства в банках	1104	20 509	20 340
6	Ценные бумаги	1105	152 414	110 788
7	Кредиты клиентам	1106	280 900	238 375
8	Производные финансовые активы	1107	10	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	150	150
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	39 298	38 237
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 595	1 669
13	Отложенные налоговые активы	1112	173	173
14	Прочие активы	1113	5 820	6 185
15	ИТОГО активы	11	594 027	482 092
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	127 158	59 210
19	Средства клиентов	1203	341 227	300 593
20	Ценные бумаги банка	1204	10 465	6 674
21	Производные финансовые обязательства	1205	93	860
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	2 658	3 405
24	ВСЕГО обязательства	120	481 601	370 742
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	66 056	66 056
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	4 955	4 227
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	12 638	12 456
30	Накопленная прибыль	1215	28 777	28 611
31	ВСЕГО собственный капитал	121	112 426	111 350
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	594 027	482 092

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2020 г.

Наименование банка: ОАО «Паритетбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2020	01.04.2019
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	7 071	7 255
2	Процентные расходы	2012	4 629	3 977
3	Чистые процентные доходы	201	2 442	3 278
4	Комиссионные доходы	2021	3 707	3 618
5	Комиссионные расходы	2022	763	652
6	Чистые комиссионные доходы	202	2 944	2 966
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	1 613	710
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	4 449	1 112
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(83)	177
11	Чистые отчисления в резервы	207	3 471	988
12	Прочие доходы	208	646	339
13	Операционные расходы	209	7 073	6 060
14	Прочие расходы	210	450	259
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	1 017	1 275
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	128	329
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	889	946

Председатель Правления И.В. Катибников

Главный бухгалтер-начальник управления Е.М. Скриба

Адрес соответствующей страницы интернет-сайта банка, где размещена отчетность о деятельности банка в полном объеме https://www.paritetbank.by/about/finance-statements/kvartal/2020/finansovaya-otchetnost-za-1-kvartal-2020-goda/

ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809.
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5.

«На вялікія выхадныя просім усіх заставацца дома»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І. Карабан: — Будзе праведзена ацэнка гэтых тэстаў, прынята рашэнне па допуску ва ўстановы аховы здароўя, а таксама — платна ці не можна будзе іх здаваць усім ахвотным.

— Калі каранавірус працякае бессімптомна, антыцелы могуць не выпрацоўвацца?

І. Карпаў: — Па-першае, бессімптомнае цячэнне COVID-19 здараецца не так часта, як пры іншых рэспіраторных вірусных захворваннях. Па-другое, бессімптомнае цячэнне ў меншай ступені ўплывае на выпрацоўку антыцел, чым можа здавацца. Тут вялікае значэнне мае імунны статус чалавека. Часта на цячэнне захворвання ўплывае інфіцыруючая доза — колькасць віруса, якая пранікла ў арганізм. Антыцелы выпрацоўваюцца ва ўсіх здаровых людзей. А вось калі імунітэт аслаблены, узнікаюць праблемы з іх выпрацоўкай, у такіх людзей захворванне працякае больш цяжка.

— Чым каранавірусная пнеўманія адрозніваецца ад іншых?

І. Карпаў: — Заўсёды ўзнікае пытанне розніцы паміж вірусной пнеўманіяй і бактэрыяльнай. Калі размова ідзе пра бактэрыяльную, мікраарганізмы выклікаюць запаленне, інтаксікацыю арганізма, павышэнне тэмпературы, пагаршэнне агульнага самаадчування. Лакальны бактэрыяльны працэс праходзіць па сваіх законах, і мы добра яго вызначаем: такое запаленне выслухоўвае ўрач, яго паказвае і рэнтгеналагічнае даследаванне — на здымку, як правіла, лакальныя, мясцовыя праявы.

Калі размова ідзе пра вірусную пнеўманію, у тым ліку і каранавірусную, парушаецца сасудзістая пранікальнасць, працэс ідзе дыфузна (рассеяна. — **«Зв.»**), а не лакальна. На камп'ютарнай тамаграфіі ўзнікае карціна з дыфузным паражэннем лёгкіх.

Нельга сказаць, што бактэрыяльная пнеўманія, асабліва пнеўмакокавая, працякае лягчэй. Гэта сур'ёзнае захворванне. Іншая рэч, што пры бактэрыяльнай пнеўманіі эфектыўныя антыбіётыкі. Маем мы і дастаткова дзейсныя супрацьвірусныя сродкі пры грыпозных змяненнях у лёгкіх. Ёсць, напрыклад, добры прэпарат флустоп, які выпускаецца айчыннымі вытворцамі. І, на жаль, у цяперашні час мы не можам сказаць, што існуе этыятропная тэрапія пры каранавірусной інфекцыі. Але ў свеце ёсць напрацоўкі па лячэнні гэтай паталогіі.

— Якія ўскладненні выклікае каранавірус?

І. Карпаў: — Па-першае, развіваюцца больш цяжкія формы хваробы, асабліва ў сталых людзей — з пнеўманіяй, дыхальнай недастатковасцю. Пазалёгачныя ўскладненні ўзнікаюць значна радзей. Гэта сардэчныя ўскладненні, калі пацыенту патрабуецца падтрымка артэрыяльнага ціску інфузійнай тэрапіяй. Нячаста, але ўзнікае нырачная недастатковасць. Ну і тое, што асабліва хвалюе спецыялістаў, якія займаюцца рэанімацыяй хворых, — гэта так званы сіндром паліорганнай недастатковасці, калі функцыянальныя парушэнні маюцца з боку розных органаў і сістэм.

— Якімі лекамі лечаць COVID-19 у Беларусі? Гэта беларускія распрацоўкі ці рэкамендацыі СААЗ?

І. Карпаў: — Мы арыентуемся на рэкамендацыі СААЗ. Этыятропнага лячэння для элімінацыі віруса няма. Лекавыя сродкі ад ВІЧ-інфекцыі, якія абмяркоўваліся раней, не апраўдалі спадзяванняў. Сёння найчасцей прымяняецца хларахін у спалучэнні з азітраміцынам. Тэрапіі, якая падыходзіць усім, няма.

— Ці ёсць у Беларусі асаблівасці цячэння каранавіруса, якіх не адзначаюць замежныя медыкі? Які працэнт пнеўманій у Беларусі?

І. Карпаў: — Мы не назіраем асаблівасцяў цячэння — захворванне развіваецца па тых жа законах, што і ва ўсім свеце. Пакуль рана ацэньваць працэнт пнеўманій, гэта залежыць ад выбаркі пацыентаў, колькасці абследаваных і тых, каму выконвалася КТ. Але частка пнеўманій працякае сур'ёзна.

— Па якіх крытэрыях урач вызначае, што COVID-19 можна лячыць амбулаторна?

— Калі пацыент пажылы з сур'ёзнымі фонавымі захворваннямі, калі можна меркаваць пра цяжкае цячэнне інфекцыі, размовы пра амбулаторнае лячэнне не ідзе. Калі гэта малады чалавек з малой клінічнай сімптаматыкай і нязначным прагрэсаваннем, з добрым імунітэтам, то лячэнне магчымае амбулаторна.

— Часам у стацыянары пацыента кладуць на жывот — для чаго гэта робіцца?

І. Карпаў: — Гэта эфектыўная методыка, якая дазваляе пацыенту дыхаць і, што называецца, расправіць лёгкія. Наш галоўны рэаніматолаг пераварочваў хворага на жывот, даваў больш інтэнсіўны паток кісларода, і на вачах павялічвалася сатурацыя (насычэнне крыві кіслародам. — **«Зв».**).

— На якія сімптомы звярнуць увагу на самаізаляцыі? У якіх выпадках трэба выклікаць урача, а ў якіх можна папіць гарбаты з малінай?

І. Карпаў: — Самы часты сімптом каранавірусной інфекцыі, які назіраецца амаль у 90 %, — павышэнне тэмпературы. У такім выпадку трэба звяртацца па медыцынскую дапамогу. Урач павінен ацаніць цяжкасць стану, акрамя таго, узрост пацыента, фонавыя хваробы. Таксама важныя сімптомы — кашаль, цяжкае дыханне і задышка. Калі яны з'явіліся разам з павышэннем тэмпературы, чакаць не трэба: у такіх выпадках гарбата з малінай не дапамогуць.

— Якія правілы самаізаляцыі, калі жывеш разам з малымі дзецьмі ці пажылымі бацькамі?

І. Карабан: — Самаізаляцыя азначае, што ўсе 14 дзён нельга выходзіць з кватэры, варта замаўляць дастаўку прадуктаў, не кантактаваць з кур'ерам. А таксама абмежаваць кантакты з членамі сям'і — трымаць ад іх дыстанцыю 1-1,5 метра, часта мыць рукі, карыстацца антысептыкамі, праветрываць памяшканне і рабіць вільготную прыборку. Пажадана, каб у вас быў асобны пакой, асобныя посуд, ручнікі, пасцельная бялізна і іншыя прадметы гігіены. Неабходна забяспечыць бескантактную перадачу ежы. Калі ёсць неабходнасць хадзіць па кватэры, то варта насіць маску і аднаразовыя пальчаткі.

— Калі каранавірус працякае ў лёгкай форме, ці можна выходзіць у краму і аптэку?

І. Карабан: — Кватэру пакідаць нельга, бо вы з'яўляецеся крыніцай хваробы для навакольных.

— Чым апрацоўваць кватэру, калі хварэеш на каранавірус дома?

І. Карабан: — Вірус асядае на любыя паверхні. Таму прыборку варта рабіць часта — з любым мыючым сродкам, які маеце. Лепш у пальчатках, бо мыючыя сродкі ўздзейнічаюць на скуру рук. Таксама важна праветрыванне і апрацоўка ўсіх прадметаў, якімі карыстаецца хворы, — тэлефонных апаратаў, пультаў, камп'ютарнай клавіятуры і мышкі, санітарна-тэхнічнага абсталявання.

— Ці можна прынесці вірус з вуліцы на абутку і адзенні? Ці патрэбны дэзынфіцыруючыя дыванкі?

І. Карабан: — Няма даказаных звестак, што вірус перамяшчаецца з дапамогай абутку і вопраткі. Дыванкі выкарыстоўваюцца ў стацыянарах, дзе медперсанал пераходзіць з «бруднай» у «чыстую» зону, каб не дапусціць заносу вірусу. У хатніх умовах у ім няма сэнсу.

— Як часта і доўга трэба апрацоўваць пад'езд, калі хтосьці ў самаізаляцыі?

І. Карабан: — Калі ўлічыць, што самаізаляцыя прадугледжвае, што хворы не пакідае кватэру, то дадатковай апрацоўкі не патрабуецца. Службы ЖКГ праводзяць прыборку штодзённа.

— Частка кампаній працуе аддалена, і кур'еры прывозяць дадому дакументы на подпіс. Ці павінны кур'ер і той, хто з імі працуе, быць у пальчатках?

І. Карабан: — У такіх выпадках мэтазгодна карыстацца электронным подпісам. Калі яго няма, асаблівых мер пры перадачы і рабоце з дакументамі не прадугледжана. Калі кур'ер клапоціцца пра здароўе, можа надзець маску і пальчаткі.

— Частка вучняў займаецца дома, але настаўнікі просяць бацькоў раз на тыдзень прыносіць сшыткі на праверку. Ці павінен настаўнік быць у пальчатках пры праверцы?

І. Карабан: — Вірус на паверхні паперы — пытанне пакуль спрэчнае. Яго РНК выяўлялася, але наколькі ён жыццяздольны, не высветлена. Калі настаўнік баіцца, можа надзець аднаразовыя пальчаткі.

— Каранавірус б'е па тых, у каго аслаблены імунітэт. Як яго ўмацаваць з дапамогай харчавання?

К. Пратасава: — Харчаванне — толькі адзін з фактараў, якія ўплываюць на імунітэт. Ён мае бялковую прыроду, таму важна ўжываць мясныя прадукты, птушку і рыбу. Таксама бабовыя, арэхі. Уключайце ў рацыён агародніну і фрукты — не менш за 400 грамаў. Харчуйцеся чатыры разы на дзень, можна дадаць адзін-два перакусы — якраз фруктамі. Соль і цукар ужывайце па мінімуме. Прытрымлівайцеся пітнога рэжыму. Памятайце, што 60 % вадкасці паступае з ежай. Карыснае піццё — звычайная вада. Падыдуць таксама гарбата — чорная, зялёная, чырвоная, таксама кампот ды морс.

Паколькі лёгкія — тлушчазалежны орган, 20 грамаў масла ў суткі карысныя. Таксама ўжывайце яйкі, раслінныя тлушчы і тлустую рыбу — неабавязкова сёмгу ці фарэль, падыдуць селядзец і скумбрыя. Адмаўляйцеся ад фастфуду і рафінаваных прадуктаў.

— Цэны на імбір і лімоны выраслі. Яны сапраўды могуць дапамагчы?

К. Пратасава: — Гэта маркетынгавая спекуляцыя, бо няма ніводнага даследавання, якое пацвярджае, што рэчывы імбіру ці лімона кагосьці вылечылі ад каранавіруса. У замарожаных чорных парэчках вітаміну С больш, чым у лімонах. Умацоўваюць імунітэт куркума, мёд, балгарскі перац, брокалі, а таксама цалкам даступныя нам цыбуля і часнок.

— Як часта правяраюць тых, хто знаходзіцца на самаізаляцыі? Ці шмат парушальнікаў?

В. Чамаданава: — Правяраюць штодзённа. За мінулыя суткі праверылі 10 432 чалавекі, 530 адсутнічалі дома. Ёсць выпадкі, калі прыцягвалі адсутных да адказнасці, складзена каля 200 пратаколаў, максімальны пакуль штраф, якім пакаралі, — 45 базавых велічынь.

І. Карабан: — Напрыканцы дадам, што на вялікія выхадныя яшчэ раз просім усіх заставацца дома, каб праз тыдзень мы не атрымалі імклівага росту захваральнасці.

Алена КРАВЕЦ.